УДК 908 (792.01)

# ВІЦЕБСКІ ЕЗУІЦКІ ШКОЛЬНЫ ТЭАТР: АДЗІНСТВА РЭЛІГІЙНАГА І СВЕЦКАГА

**Уткевіч Вольга Іванаўна, кандыдат філалалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін**
**Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,**
**г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: Віцебск, езуіцкі калегіум, культура, каталіцтва, праваслаўе, тэатр.

Рэферат. Артыкул прысвечаны разгляду дзейнасці школьнага театра, які быў створаны пры Віцебскім езуіцкім калегіуме, і яго ўплыву на паўсядзённае жыццё гараджан. Тэатр разглядаўся езуітамі ў выглядзе школы добрых манер, спектаклі ставіліся не толькі на чыста рэлігійныя, але і на пераважна маральна-дыдактычныя тэмы. Езуіцкі тэатр знаёміў жыхароў тагачаснага Віцебска з лепшымі ўзорамі заходнееўрапейскай культуры.

Віцебскі школьны тэатр працаваў у перыяд з 1671 па 1766 гг. Ён дзейнічаў у будынку езуіцкага калегіума, быў створаны пад патранатам езуітаў і дзякуючы намаганням настаўнікаў установы. Па сваёй вядомасці і значнасці ён лічыўся чацвертым, саступаючы падобным тэатрам у Полацку, Гродна і Пінску.

Езуіты (Societas Jesus – Таварыства Ісуса) – гэта адзін з каталіцкіх духоўных ордэнаў, які быў заснаваны у XVI ст. вядомым дзеячом контррэфармацыі Ігнаціем Лаёлай, меў вялікую колькасць адэптаў і праводзіў паспяховую місіянерскую дзейнасць на розных тэрыторыях. Першыя прадстаўнікі ордэну з’явіліся на беларускіх землях яшчэ ў часы ВКЛ (П. Скарга, С. Лянчыцкі), аднак значна пашырылася яго ўплывовасць ў Рэчы Паспалітай. Адукацыйная сістэма езуітаў у свой час з’явілася першай цэльнай канцэптуальнай праграмай штодзённага навучання і выхавання, да таго ж яна была навукова і светапоглядна абгрунтаваная. Менавіта праз крытыку езуіцкай канцэпцыі фарміруюць свае ўласныя педагагічныя падыходы і погляды Я. А. Каменскі, Б. Паскаль. Строга і іерархічна арганізаваная, дысцыплінарная агульная праграма працы ордэна распаўсюджвалася на ўсе сферы чалавечай дзейнасці, у тым ліку і на адукацыйны працэс, дзе не абмяжоўвалася выключна тэалогіяй, але ўключала ў сябе аваладанне поўным комплексам гуманітарных ведаў. У галіне педагогікі езуіты паставілі асноўнай выхаваўча-адукацыйнай задачай максімальна наблізіць вучняў, выхадцаў з розных сацыяльных груп, да этыкету, нораваў вышэйшага свету. Іх сістэма адукацыі паступова пачала прымяняцца з XVI стагоддзя ў езуіцкіх калегіях па ўсёй Еўропе, прычым пазначаныя ўстановы адрозніваліся строгай рэгламентацыяй паводзін навучэнцаў. Вельмі хутка яны сталі лічыцца ўзорнымі незалежна ад таго, якую кар’еру – духоўную ці свецкую – збіраўся надалей абраць выхаванец.

Школьны тэатр у калегіумах адыгрываў адну з важных роляў у выхаванні і навучанні не толькі будучых святароў, але і свецкага чалавека. Выхаванцам школ, якія рыхтаваліся да духоўнай або дзяржаўнай працы, рэкамендавалася навучацца сцэнічнаму мастацтву для ўдасканалення ў высакароднасці манер і асабліва ў рыторыцы, красамоўстве. Неабходна адзначыць, што своеасаблівая мода на такія ўстановы ў XVII ст. закранула ўсё насельніцтва беларускіх, украінскіх і часткі расійскіх гарадоў: як каталікоў, так і праваслаўных, а таксама прадстаўнікоў іншых канфесій. Безумоўна, пераважная большасць жыхароў Віцебшчыны належыла да праваслаўя, і гэта абумовіла пэўныя перавагі ў стаўленні да культурных з'яў. Адрозненні былі дэтэрмінаваныя ў першую чаргу не эстэтычнымі момантамі, а светапоглядными разыходжаннямі паміж праваслаўем і каталіцтвам наогул. Вядомы расійскі мысляр І. А. Ільін адзначаў, што галоўная асаблівасць народа заключана ў «духоўным акце». На ягоную думку, духоўны акт трэба разумець як «унутраны лад і ўклад чалавека: яго спосаб адчуваць, сузіраць, думаць жадаць і дзейнічаць» [1, с. 384]. У цэлым, на наш погляд, гэтыя словы апісваюць чалавечае мысленне, якое разумеецца ў найболей агульным сэнсе гэтага слова. У найбольшай жа ступені адрозненне праваслаўнага ад каталіцкага мыслення заключаецца ў тым, што першае мае сузіральны характар. Дадзеная сузіральнасць у рознай ступені знайшла свой выраз ва ўсіх сферах чалавечага жыцця, у тым ліку і ў культуры, таму тэатр і акцёрства наогул не заахвочваліся з боку праваслаўнай царквы.

Каталіцкая місія была больш адкрытая да дзейснасці і свецкасці. Так, напрыклад, тэатр разглядаўся езуітамі ў выглядзе школы добрых манер, якія было неабходна прывіць маладым людзям, гэта значыць, па сутнасці, дыдактычна выхаваць у іх мілагучнае вымаўленне, высакароднасць рухаў, знешнюю элегантнасць і вытанчанасць. Таксама тэатр уключаў у сябе своеасаблівы гульнявы трэнінг, у межах якога ажыццяўляўся працэс прайгравання розных грамадскіх роляў і сітуацый. Вядома, такі падыход шмат у чым меў станоўчыя бакі. Школа добрых манер – гэта ў тым ліку выпрацоўка пэўнай дысцыпліны, прычым не толькі знешняй, але ў вялікай ступені ўнутранай. Прыхільнікі адукацыі ў калегіумах адзначалі, што людзям неабходна вучыцца добраму, незалежна ад таго, дзе яны гэта добрае знайшлі.

Езуіцкі тэатр меў яшчэ адно важнае значэнне. Справа ў тым, што пастаноўкі ў ім іграліся на лацінскай мове, што павінна было садзейнічаць удасканаленню навучэнцаў у веданні гэтай мовы, якая, дарэчы, лічылася мовай міжнародных зносін у тыя часы, а таксама лепшаму засваенню канонаў і догмаў каталіцкай царквы. Нельга не пагадзіца з аўтарамі артыкула «Мастацкая культура ў дзейнасці езуіцка-каталіцкіх навучальных устаноў на Падзвінні, Паазер'і і Верхнім Падняпроўі ў XVII – першай чвэрці XIX стст.» А. В. Русецкім і Ю. А. Русецкім, якія адзначалі: «Дзейнасць ордэна «Таварыства Езуса» ў сферы адукацыі і асветы, нягледзячы на зададзенасць і адназначна антыправаслаўную і антыбеларускую скіраванасць, нельга ацэньваць адназначна. Меўшая рэлігійна-гуманітарны характар, адукацыйная справа выкарыстоўвала шырокі набор педагагічных метадаў і сродкаў, якія дазвалялі ўзмоцнена распаўсюджваць навуковыя веды і заходнееўрапейскую

культуру на беларускіх землях» [2, с. 31].

Акрамя латыні, некаторыя спектаклі ставіліся і на польскай мове. Да таго ж, у другой палове XVIII ст. у народных сцэнках (інтэрмедыях) можна было пачуць старабеларускую мову. Вядома, такая гаворка не была літаратунай, але, калі ўлічваць факт, што беларуская мова, па сутнасці, знаходзілася пад забаронай, то гэта была ў пэўнай ступені пазітыўная з'ява. Так, напрыклад, польская драма «Містычнае прычасце вяселля Генсерыка і Трызімунда» паміж дзеямі ўключала і беларускія інтэрмедыі, змешчаныя потым у «Аршанскім кодэксе». Акрамя таго, актыўнае карыстанне польскай мовай было абумоўлена тым, што аўтарамі і пастаноўшчыкамі з'яўляліся палякі – выкладчыкі паэтыкі і рыторыкі – такія, як Д. Крачатоўскі і С. Макоўскі, а таксама сам рэктар калегіума Ян Заранак.

Натуральна, што тэатральныя прадстаўленні не адбываліся кожны дзень, яны іграліся толькі ў дні каталіцкіх святаў. Прычым, сцэны для спектакляў будавалася на рынкавай плошчы, а таксама побач з ратушай, перад касцёламі і ў рэкрэацыйных залах калегіума. Уражвае колькасць ўдзельнікаў прадстаўленняў: іх бывала больш за 50–60 чалавек. Фінальныя сцэны часта суправаджаліся маляўнічымі феерверкамі. Дзеля справядлівасці адзначым, што яны вельмі падабаліся публіцы, але не ўхваляліся езуітамі. Цікава, што спектаклі ставіліся не толькі на чыста рэлігійныя тэмы, але і на пераважна маральна-дыдактычныя. Спектакль «Казанне рускае схізматычнае», у прыватнасці, быў прысвечаны побытавай свецкай тэме: крытыцы залішне модных, на думку каталіцкіх манахаў, віцебскіх гараджанак. Зварот да актуальных тэм паўсядзённасці быў надзвычай важным для жыхароў горада на той час, бо іншых тэатраў і падобных відовішчаў у Віцебску тады не існавала. У перыяд, калі езуіцкі тэатр зрабіўся папулярным на беларускіх землях, нямецкім выкладчыкам, прадстаўніком ордэна езуітаў Ф. Лангам ужо была напісана і выдадзена праца «Развažанні пра сцэнічную гульню» (1727 гг.), да якой звярталіся рэжысёры пастановак, бо там быў абагулены вопыт двух стагоддзяў існавання езуіцкага тэатра па прыёмах сцэнічнай гульні, выкарыстанні тэатральных механізмаў, абранні рэпертуару. Напрыклад, падкрэслівалася, што пабудова мізансцэн павінна адпавядаць прынцыпам кампазіцыі ў свецкім жывапісе, сцэнічная гульня павінна падпарадкоўвацца не толькі законам мастацтва, але і прыроды.

Паэтыка езуіцкага тэатра імкнулася да філасофскага абстрагавання і іншасказанняў. На наш погляд, у гэтым выяўлялася імкненне захаваць гістарычную пераемнасць, бо, як вядома, сярэднявечная каталіцкая філасофія была вельмі развітай. Тэалагічная спадчына Аўгустына Аўрэлія, Фамы Аквінскага, П'ера Абеляра, Уільяма Акама і іншых дагэтуль вывучаюць студэнты ў курсе філасофіі або тэалогіі ў свецкіх і ў рэлігійных навучальных установах. Адпаведна, спектаклі былі напоўнены філасофскім сімвалізмам і алегорыямі. Так, напрыклад, п'еса, напісаная ў 1737 годзе для Віцебскага тэатра – «Каштоўны камень у дзюбе крумкача Гансеўскіх, які ўпрыгожвае дзядоў пярсцёнак Корвінаў», была прысвечана гербу мясцовых шляхецкіх магнатаў Корвінаў-Гансеўскіх, а таксама стагоддзю заснавання Віцебскай езуіцкай калегіі смаленскім ваяводам Аляксандрам Корвінам-Гансеўскім.

Дадзеная п’еса складалася з наступных трох дзеянняў: алегарычны пралог, хоры і эпілог, а паміж дзеяннямі іграліся інтэрлюдыі. Пралог апісваў, як «набожнасцю і адвагай разломліваючы, знішчаючы, раскідваючы ганебныя лісты (Аляксандр Гансеўскі) узводзіць высокі слуп мудрасці» [3]. Эпілог жа быў прысвечаны таму, як «Віцебскі Апалон», апякун муз, нашчадак Корвінаў, услаўляе тут імя «смаленскага яснавяльможнага спадара Гансеўскага» [3]. Цікава адзначыць, што алегарычныя персанажы не выяўляюць адцягненыя паняцці, а вылучаюць адметныя рысы канкрэтных людзей (як тут Александр Гансеўскі), ствараюць індывідуалізаваныя характарыстыкі. Дарэчы, менавіта падобнага кшталту пафасныя алегорыі і давалі магчымасць ставіць на сцэне феерычныя відовішчы. Акрамя таго, яны аздабляліся панегірыкамі, прысвячэннямі і музычнымі хорамі, якія выконваліся вучнямі музычнай бурсы і капэлы, створаных пры калегіуме. Можна сказаць, што езуіцкі тэатр выхоўваў у жыхароў Віцебска музычны густ, бо толькі тут на той час можна было паслухаць прафесійнае высокамастацкае выкананне лепшых узораў заходнееўрапейскай музыкі.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што Віцебскі школьны тэатр адыграў значную ролю ў распаўсюджванні культуры, прычым не толькі чыста рэлігійнага накірунку, але і свецкага: спрыяў знаёмству жыхароў Віцебска з лепшымі ўзорамі заходнееўрапейскай музыкі, літаратуры, філасофіі.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Ильин, И. А. Собрание сочинений в 10 т. / И. А. Ильин. – Т.2. Кн.1. – Москва : Русская книга, 1993. – С. 384.

2. Русецкий, А. В. Художественная культура в деятельности иезуитско-католических учебных заведений на Подвинье, Поозерье и Верхнем Поднепровье в XVII – первой четверти XIX в. / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова. Общественные и гуманитарные науки. История. – Т.6. – 2007. – С. 3 – 32.

3. Школьный театр при иезуитском коллегиуме [Электронный ресурс] – Режим доступа http://www.evitebsk.com/wiki/B5 – Дата доступа 06.03.2024.